Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2024-08-02

# Багаты плён дзейнасці навукоўца

**У Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «“Высокія арбіты грамадзянскасці”: гісторыя, лёс, асобы», прысвечаная 80-годдзю знанага літаратурнага даследчыка, доктара філалагічных навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Сцяпана Лаўшука.**

Са словамі віншавання і падзякі да юбіляра звярнуліся акадэмік Аляксандр Каваленя, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства Іван Саверчанка, кандыдат гістарычных навук Вячаслаў Даніловіч ды іншыя. Выступоўцы адзначылі плённую навуковую і грамадскую дзейнасць вучонага, які даў пуцёўку ў навуку многім маладым даследчыкам. Педагог і вучоны, аўтар шматлікіх навуковых прац, манаграфій, Сцяпан Лаўшук шмат зрабіў для арганізацыі працы навуковай супольнасці, на працягу 20 гадоў ён ўдзельнічаў у экспедыцыях «Дарога да святыняў».

На канферэнцыі было падкрэслена, што Сцяпан Лаўшук прычыніўся да выпуску поўнага збору твораў Івана Навуменкі і іншых акадэмічных выданняў. Ён даследаваў прыроду драматургічнага канфлікту ў п’есах Кандрата Крапівы, Андрэя Макаёнка, Мікалая Матукоўскага і іншых, цікавіўся адлюстраваннем надзённых праблем сучаснасці ў беларускай драматургіі. Вучоны даследаваў сацыяльна-эстэтычную місію драматургіі, яе сувязь з жыццём, цікавіўся тэатральнай дзейнасцю Лопэ дэ Вэгі, Шэкспіра, Мальера, Рамэна Ралана, аналізаваў месца чалавека ў свеце сцэнічнага мастацтва.

Цёплымі ўспамінамі падзяліўся брат вучонага — Аляксей Лаўшук. У рамках мерапрыемства была разгорнута кніжная выстаўка «Адкрывальнік мацерыка беларускай літаратуры», падрыхтаваная да 80-годдзя навукоўца.

**Эла ДЗВІНСКАЯ**

Эла Дзвінская. Багаты плён дзейнасці навукоўца